Источник: “Голас Радзімы” – 2015-01-15

# Ён пачуў плач перапёлкі

Даследчыкі і аматары творчасці Івана Чыгрынава, яго сябры і родныя адзначылі 80-я ўгодкі Народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава



Да юбілею класіка Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры сумесна з Цэнтральнай навуковай бібліятэкай імя Якуба Коласа НАН Беларусі падрыхтавалі выставу “Іван Чыгрынаў. “Адтуль, з бацькоўскага парога…”. Такую ж назву мела сама імпрэза ў бібліятэцы, на якую сабраліся даследчыкі і аматары творчасці пісьменніка, яго сябры і родныя. Згадвалі радок аўтабіяграфіі Івана Гаўрылавіча, у якім адлюстравана асаблівае яго паяднанне з малою радзімаю: “Мясціны гэтыя дарагія для мяне не толькі тым, што адтуль, з бацькоўскага парога, уецца сцяжынка майго жыцця. Там, у Забесяддзі, на Магілёўшчыне, назаўсёды засталіся сляды маіх герояў, жывых і мёртвых, пра якіх я расказваю у раманах”. Нарадзіўся ж ён 21 снежня 1934 года ў вёсцы Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна. Вайна прайшлася па ягоным дзяцінстве, і вясковец  Чыгрынаў імкнуўся паказаць праўду суровага і гераічнага часу ў сваіх творах. Прычым ён мудра заўважыў: “Вопыт мінулай вайны — не толькі перажыты вопыт. Гэта і навука пра будучыню”.

Больш за тры дзесяцігоддзі напружанай творчай працы наканаваў яму лёс. У друку ён дэбютаваў вершам у 1952-м, як празаік — у 1958-м у газеце “Чырвоная змена”. Аўтар шэрагу кніг апавяданняў і аповесцяў, раманаў “Плач перапёлкі”, “Апраўданне крыві”, “Свае і чужыя” ды іншых, а таксама п’ес,  кнігі крытыкі і публіцыстыкі. У 1984-м выйшлі Выбраныя творы Івана Чыгрынава ў 3-х тамах. Ён лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1974), Народны пісьменнік Беларусі (1994).

Іван Чыгрынаў вядомы не толькі як пісьменнік: з 1986 года ён — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, з 1987-га — старшыня праўлення Беларускага аддзялення Савецкага фонду культуры. У 1989-м Іван Гаўрылавіч узначаліў рэдакцыю часопіса “Спадчына”. Памёр 5 студзеня 1996 года, пахаваны на Усходніх (Маскоўскіх) могілках Мінска. На выставе прадстаўлены матэрыялы з музейных фондаў: фотаздымкі, рукапісы, кнігі з аўтографамі, асабістыя рэчы.

Выступоўцы адзначалі: творчасць Івана Чыгрынава — яркая старонка ў беларускай прозе. Ён умеў глыбока пранікнуць у свет чалавека, узняць значныя праблемы, цудоўна валодаў майстэрствам пісьменніка.

Рыгор Арэшка